Інтэграцыя

# Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі не абмяжоўваецца форумам рэгіёнаў

## На парадку дня — пастаяннае сумеснае інавацыйнае развіццё

**Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — падзея, якая праходзіць раз на год, але работа над задачамі і планамі, якія ён ставіць, ідзе круглы год. Прынамсі, як і супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў самых розных сферах. Міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву нашых краін і форуму рэгіёнаў як яго сімвалу была прысвечана сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з намеснікам старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Юрыем ВАРАБ'ЁВЫМ.**

ЮрыйВараб'ёў — сустаршыня арганізацыйнага камітэта Форуму рэгіёнаў. Наталля Качанава падкрэсліла, што ў беларускага боку ёсць шэраг прапаноў наконт правядзення чарговага форуму. Самая значная з іх — правесці форум не ў адным горадзе, а ў двух, якія размешчаны побач. Спікер Савета Рэспублікі таксама падкрэсліла, што Форум рэгіёнаў будзе праходзіць два дні. Першы дзень плануецца прысвяціць рабоце секцый, другі — пленарнаму пасяджэнню. «Віцебск прапануецца для правядзення пленарнага пасяджэння, выставак, канцэртнай праграмы, горада майстроў, які можна будзе шырокамаштабна разгарнуць. У Віцебску гэта будзе зроблена вельмі добра, там штогод праходзіць «Славянскі базар» і ёсць досвед. Акрамя таго, нашы мерапрыемствы будуць праходзіць у дні «Славянскага базару». Але мы жадаем вам паказаць яшчэ Полацк. Гэта самы старажытны горад нашай краіны — упершыню згадваецца ў 862 годзе. Там ёсць шмат таго, што нас аб'ядноўвае. З Валянцінай Іванаўнай Матвіенка мы абмеркавалі тэматыку маючага адбыцца форуму і сышліся ў тым, што гэта павінна быць — сумеснае інавацыйнае развіццё нашых краін, рэалізацыя саюзных праграм, у прыватнасці імпартазамяшчэння, каб нам забяспечыць сёння сваю эканамічную бяспеку», — сказала Наталля Качанава.

Абмеркаванне вынікаў і перспектыў сумеснай работы працягнулася падчас Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. **Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ** падчас пасяджэння заўважыў, што за дзевяць месяцаў бягучага года тавараабарот паміж Беларуссю і Расіяй склаў 35,5 мільярда долараў. Гэта амаль на 11 працэнтаў больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, у якім узаемны гандаль таксама біў усе рэкорды. «Але гэта высокая планка не спыняе нашы ўрады і нашы прадпрыемствы, якія павялічваюць тавараабарот», — заўважыў ён. Таксама Валерый Бельскі звярнуў увагу, што працягваецца рэалізацыя інвестыцыйных праектаў на прамысловых прадпрыемствах Беларусі, у тым ліку за кошт крэдытных сродкаў Расійскай Федэрацыі. «Дзейнасць гэтых прадпрыемстваў арыентавана ў першую чаргу на выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі, якая будзе запатрабавана і ў Беларусі, і ў Расіі. У цэнтры ўвагі кіраўнікоў нашых дзяржаў і ўрадаў — далейшае развіццё кааперацыйных сувязяў і новых сумесных праектаў. Безумоўна, дастойны ўклад у агульную дынаміку ўносіць штогадовы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі», — падкрэсліў ён.

Другое пытанне на парадку дня пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі было звязана з фарміраваннем заканадаўства Беларусі і Расіі на прыкладзе мяккага падыходу да мадэльнага заканадаўства. «Мадэльныя законы ствараюцца не дзеля таго, каб іх у такім выглядзе прыняць. Гэта толькі вопыт, прапанова да фарміравання законаў Саюзнай дзяржавы. Таму важная тэма, мы абмеркавалі, як гэта лепш рабіць, як планаваць гэтую працу, у якіх сферах нам трэба развіваць гэта супрацоўніцтва», — расказаў Юрый Вараб'ёў.

Актыўна абмяркоўвалася пытанне станкабудавання. Па словах Юрыя Вараб'ёва, на прыкладзе Ніжагародскай вобласці відаць, што рэгіёны паміж сабой развіваюць вельмі складаныя вытворчыя праекты, напрыклад, такія, як завод па будаўніцтве станкоў. «Гэта няпростае пытанне, але вельмі важнае для нашых дзяржаў. Мы ўбачылі, што некаторыя міждзяржаўныя праекты могуць быць рэалізаваны з дапамогай бюджэту Саюзнай дзяржавы, і тут ёсць перашкоды. Мы разгледзелі гэтыя перашкоды, мы ўнясём свае прапановы, як палепшыць выкарыстанне саюзнага бюджэту для сумесных навукова-тэхнічных распрацовак у агульных інтарэсах пры развіцці нашых прамысловых аб'ектаў», — адзначыў ён.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** у размове з журналістамі падкрэсліў, што пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі — гэта свайго роду зверка гадзіннікаў па рэалізацыі дамоўленасцяў, якія абмяркоўваліся на форумах рэгіёнаў Беларусі і Расіі, рэалізацыі дагавораў аб супрацоўніцтве, якія былі заключаны. «Сёння, напрыклад, мы абмеркавалі дагаворы, якія былі заключаны паміж Гомельскай і Ніжагародскай абласцямі. Гэта адно з такіх канцэптуальных пытанняў, якое з'явілася сёння прадметам абмеркавання. Другое пытанне датычылася развіцця мадэльнай заканатворчасці інстытутаў мяккага права ў частцы збліжэння, уніфікацыі, гарманізацыі заканадаўстваў дзвюх краін», — сказаў ён. Сенатар назваў перспектыўным напрамак мадэльнай заканатворчасці ў частцы выпрацоўкі адзіных падыходаў да рэгулявання найбольш важных грамадскіх адносін у сферах, якія ўзаемна цікавыя для Беларусі і Расіі. У прыклад Сяргей Сівец прывёў мадэльны заканадаўчы акт «Аб сістэме абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў Саюзнай дзяржавы». У распрацоўцы знаходзіцца праект мадэльнага закона аб прыгранічным супрацоўніцтве. «Таму сёння атрымалася дастаткова канструктыўная размова. Шмат карыснай інфармацыі атрымалі члены міжпарламенцкай камісіі. Гэта сустрэча стане яшчэ адной вяхой далейшага міжпарламенцкага супрацоўніцтва і развіцця нашых інтэграцыйных дамоўленасцяў», — дадаў Сяргей Сівец.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Выбары-2024

# НА ВЫСОКІМ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ І ПРАВАВЫМ УЗРОЎНІ

## Кіраўніцтва Цэнтральнай выбарчай камісіі сустрэлася з актывам палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў

**На круглым стале былі патлумачаны навацыі выбарчага заканадаўства, асаблівасці правядзення выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання і выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Абмяркоўваўся ўдзел палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у выбарчай кампаніі. Мерапрыемства стала працягам сустрэчы Прэзідэнта з кіраўнікамі палітычных партый, якая адбылася 10 лістапада ў Палацы Незалежнасці.**

Адкрываючы круглы стол, **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** адзначыў, што ад кандыдатаў ад партый і грамадскіх аб'яднанняў чакаюць самага актыўнага ўдзелу ва ўсіх этапах выбарчага працэсу: ад вылучэння кандыдатаў да канкурэнцыі ў творчых ініцыятывах. Па яго словах, пажадана, каб у прадстаўнічыя органы ад гэтых суб'ектаў прыйшлі сапраўдныя прафесіяналы, людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія добра разумеюць, чым жыве краіна і якія мэты ў нашай дзяржавы. «Таксама важна, каб у партый, якія прыйдуць на гэтыя выбары, былі прывабныя палітычныя праекты, актуальныя з пункту гледжання бягучага развіцця краіны, — дадаў Максім Рыжанкоў. — Наша агульная задача — не толькі паказаць прывабнасць тых ці іншых ідэй, але і садзейнічаць павышэнню прававой культуры грамадзян у адносінах выбарчага працэсу, увогуле папулярызацыі самой ідэі іх прыходу на выбарчыя ўчасткі, дзе можна будзе ўбачыць яркіх, цікавых людзей, з добрымі ідэямі».

**Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА** звярнуў увагу на тое, што, у адпаведнасці са змяненнем канстытуцыйных норм, прынятых на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года, праводзіцца маштабная мадэрнізацыя палітычнай сістэмы. Па яго словах, завяршальным этапам гэтай работы будзе фарміраванне дэпутацкага корпуса ў адзіны дзень галасавання, а таксама выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу і чарговыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія павінны адбыцца не пазней за 20 ліпеня 2025 года.

Нагадаем, 20 лістапада Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 367, згодна з якім на 25 лютага 2024 года прызначаны выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання. «У адзіны дзень галасавання будуць выбірацца 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 12 514 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, — паведаміў Ігар Карпенка. — Да выбараў будуць створаны 1394 акруговыя і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, каля 5,5 тысячы ўчастковых камісій. У рабоце камісій будзе задзейнічана каля 70 тысяч чалавек».

Старшыня Цэнтрвыбаркама заўважыў, што ўдзел у выбарах возьмуць і палітычныя партыі, а таксама грамадскія аб'яднанні. Яны надзелены паўнамоцтвамі вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склады выбарчых камісій, накіроўваюць назіральнікаў, працаваць у складзе ініцыятыўных груп па зборы подпісаў грамадзян за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты, праводзіць перадвыбарную агітацыю, масавыя мерапрыемствы, сустрэчы з выбаршчыкамі.

Ігар Карпенка нагадаў, што 4 сакавіка бягучага года ўступіла ў сілу абноўленая рэдакцыя Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Ён падкрэсліў, што змяненні прайшлі шырокае грамадскае абмеркаванне, адпавядаюць міжнародным стандартам, накіраваны на развіццё выбарчай сістэмы нашай краіны, дадуць магчымасць скараціць выбарчы цыкл і расходы на правядзенне выбарчых кампаній.

Кажучы аб ролі партый і грамадскіх аб'яднанняў у жыцці грамадства, у размове з журналістамі старшыня ЦВК адзначыў, што гэта будзе залежыць ад саміх партый і грамадскіх аб'яднанняў, ад таго, якую яны праграму прапануюць, як бачаць вырашэнне тых ці іншых праблем, што, дапусцім, ёсць у сацыяльна-эканамічным або палітычным развіцці. «Партыйная праграма павінна быць адаптавана да рэальных умоў жыццядзейнасці канкрэтнага рэгіёна, калі мы кажам аб выбранні дэпутатаў мясцовых Саветаў, — адзначыў Ігар Карпенка. — Калі мы кажам аб дэпутатах парламента, то тут трэба ўлічваць бачанне партыяй тых актуальных заканадаўчых актаў, якія павінны быць прыняты ў краіне. Беларусь не стаіць на месцы, мы развіваемся, у тым ліку і прававая сістэма, жыццё дыктуе шмат новых пытанняў. Нават у рэчышчы правядзення рэферэндуму 2022 года каля 90 заканадаўчых актаў былі падвергнуты карэкціроўцы. З'явіліся новыя заканадаўчыя акты, такія як «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», «Аб Усебеларускім народным сходзе».

Сур'ёзнае абнаўленне зведаў і Выбарчы кодэкс. «Гэта звязана не толькі з тымі рашэннямі рэферэндуму, якія былі прыняты ў 2022 годзе, — патлумачыў Ігар Карпенка. — Гэта яшчэ і тыя навацыі, якія былі вызначаны, зыходзячы з практыкі прымянення выбарчага заканадаўства. І тыя прабелы, якія ў нас былі ў рамках выбарчых кампаній, мы ўважліва прааналізавалі і пастараліся ліквідаваць у выбарчым заканадаўстве».

**Па словах старшыні Беларускай партыі «Белая Русь», старшыні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алега РАМАНАВА**, правядзенне круглага стала карыснае тым, што да палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў была даведзена пазіцыя Цэнтрвыбаркама адносна нормаў заканадаўства, іх правільнай трактоўкі. «Для партый і грамадскіх аб'яднанняў гэта вельмі важна, бо мы накіраваны тое, каб працаваць выключна ў прававым полі і дзейнічаць на аснове выбарчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, — патлумачыў ён. — Другі сэнс гэтай сустрэчы — дэманстрацыя нашага адзінства і яго ўмацаванне. Прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў маглі абмеркаваць і пытанні ўзаемадзеяння ў ходзе выбарчай кампаніі, выпрацаваць шляхі сумеснага руху па дасягненні пастаўленых мэт. Думаю, што сустрэча будзе рэзультатыўнай яшчэ і ў гэтым плане».

Удзельнікі круглага стала абмяняліся меркаваннямі, задалі пытанні, якія іх цікавілі. Усё — з той мэтай, каб найбліжэйшая выбарчая кампанія прайшла на высокім арганізацыйным і прававым узроўні.

**Вераніка КАНЮТА.**